# ПЕРШАЯ ПРЫГАЖУНЯ КРАІНЫ

## «Міс Беларусь — 2023» стала Элеанора Качалоўская



Фота БелТА.

**Канцэнтрацыя таленту і прыгажосці, феерыя маладосці і творчасці, шчырая і прынцыповая барацьба — у Палацы спорту прайшоў фінал XIII Нацыянальнага конкурсу «Міс Беларусь — 2023». Гэты вечар стаў прыгожай кропкай і ў рабочым графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Кіраўнік дзяржавы таксама наведаў шоу ў Палацы спорту.**

Сёлета за тытул спрачаліся 24 дзяўчыны, якія прадстаўляюць кожны рэгіён краіны. Асноўная ідэя фінальнага шоу звязана з прыгажосцю як натхняльнай сілай для подзвігаў і творчых перамог, што вельмі сімвалічна ў Год міру і стваральнай працы.

У фінале ўдзельніцы конкурсу прадставілі публіцы пяць традыцыйных выхадаў, сярод іх — дэфіле ў народных касцюмах, купальніках, дзелавых касцюмах і заключны — у вечаровых сукенках. Хоць «Міс Беларусь» — гэта конкурс прыгажосці, журы ацэньвала не толькі знешнасць удзельніц, але і іх інтэлект, уменне падаць сябе і ўнутраную прыгажосць.

Арганізатары падрыхтавалі для гледачоў яркае шоу, напоўненае выступленнямі як знакамітых, так і пачынаючых артыстаў эстрады. Дадавала ўражанняў і візуальнае афармленне, якое суправаджалася спецэфектамі.

Кожная ўдзельніца вартая кароны, але па правілах пераможца толькі адна. «Міс Беларусь — 2023» стала Элеанора Качалоўская. Першыя эмоцыі пераможцы — шок і шчасце, якога яна не хавала. Як расказала Элеанора, яе найбліжэйшыя планы — наведаць тэатр імя Янкі Купалы і паглядзець спектакль «Паўлінка». Падчас інтэлектуальнага конкурсу дзяўчына адказвала на пытанне, звязанае з творчасцю класіка. Але ад хвалявання правільна адказаць не змагла. Затое сваю памылку прызнала і абяцала выправіць. Ды і гэта было зусім не галоўным.

СТАР. 2

# ПЕРШАЯ ПРЫГАЖУНЯ КРАІНЫ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

«Я не магу да канца паверыць, што гэта праўда. Здаецца, што ўсё яшчэ ідзе рэпетыцыя, мы столькі разоў рэпеціравалі. Але я гляджу на журналістаў, адчуваю карону на галаве і разумею, што гэта праўда. Я шакаваная, шчаслівая і вельмі ўдзячная ўсім, хто мяне падтрымліваў і дапамагаў», — падзялілася Элеанора.

«Міс Беларусь» падкрэсліла, што прысутнасць Прэзідэнта ў зале яе натхняла і падбадзёрвала. «Я адчувала, што ён падтрымліваў кожную ўдзельніцу і за кожную хваляваўся. Таму падчас дэфіле мне было спакайней, калі я глядзела на Прэзідэнта і на сваю маму», — адзначыла яна. Першая прыгажуня Беларусі таксама падзялілася, якім бачыць ідэал мужчыны: ён павінен быць шчырым, мужным і добрым. Расказала Элеанора і пра сваю мару — дастойна прадставіць Беларусь на міжнародным конкурсе прыгажосці, паказаць усяму свету прыгожосць нашай краіны. Такая магчымасць выдасца зусім хутка. Элеанора будзе прадстаўляць Беларусь на конкурсе «Міс Свет», які пройдзе 8 снежня ў індыйскім горадзе Срынагар.

Элеанора — з Мінска. Дзяўчына скончыла БДУКМ, цяпер атрымлівае другую вышэйшую адукацыю псіхолага ў педагагічным універсітэце і паралельна працуе менеджарам мадэльнага агенцтва ў Нацыянальнай школе прыгажосці. Яна распавяла, што адчувае велізарнае пачуццё падзякі сваёй краіне, і адрасавала словы ўдзячнасці асабіста кіраўніку беларускай дзяржавы: «Аляксандр Рыгоравіч, дзякуй, што вы даяце простым дзяўчатам магчымасць апынуцца ў гэтай казцы». Элеанора Качалоўская запэўніла, што будзе горда і сумленна несці тытул у найбліжэйшыя два гады.

Званне першай віцэ-міс прысуджана Ксеніі Уласюк, другой віцэ-міс стала Мілана Якімовіч. У намінацыі «Міс фота» перамогу атрымала Аліна Герасіменка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

энергічныя і мэтанакіраваныя, творчыя і прадпрымальныя. Дзякуючы гараджанам ствараліся слаўныя традыцыі, збераргаліся і прымнажаліся багацці і здабыткі беларускай сталіцы. Сёння жыхары, якія бязмежна любяць свой горад, працягваюць уносіць стваральны ўклад ва ўмацаванне эканамічнага і інтэлектуальнага патэнцыялу дарагога сэрцу Мінска, робячы яго ўсё больш прывабным і камфортным для жыцця.

Ад усёй душы жадаю вам невычэрпнай энергіі, жыццёвага аптымізму, новых прафесійных здзяйсненняў у імя гераічнага мінулага і паспяховай будучыні нашай цудоўнай сталіцы і роднай Беларусі.

Моцнага здароўя, шчасця, міру і дабра вам і вашым сем'ям».